**ЛІДА**

# ЖЫЦЬ І ТВАРЫЦЬ НАПЕРАКОР ЛЁСУ

## ЭСТАФЕТА ДАБРА

Ужо роўна тры гады назад, у 2020 годзе, у Доме Валянціна Таўлая  Лідскага гісторыка-мастацкага музея пачаў працу праект пад назвай «Перадай дабро па крузе».

Нагадаем, што першай ластаўкай у праекце стала Ганна Брэйва, а менавіта яе выяўленчыя работы, якія аб'ядналіся пад назвай «Перадай дабро па крузе». І такім чынам, было вырашана што эстафета дабра будзе перадавацца такім жа таленавітым прадстаўнікам грамадства, у якіх маюцца нязручнасці ад прыроды і пэўныя абмежаванасці ў здароўі. Да гэтых акалічнасцяў было дабаўлена вялікае «АЛЕ». Але ж яны творчыя, у іх неабмежаваныя здольнасці ў тым ці іншым майстэрстве, накірунку. За гэты час прыхільнікі творчага ладу жыцця і наведвальнікі музея змаглі пазнаёміцца з мастакамі, рукадзеламі, паэтамі. У іх, трэба падкрэсліць, багаты ўнутраны свет!  Яны захапляюцца, ствараюць добрыя справы! У нашым горадзе іх нямала. Тут для такіх людзей арганізавана і створана светлая пляцоўка, на якой кожны з іх можна разгарнуць сябе і выказаць сваё ўнутранае «Я» ў творчасці.

Праект для спецыяльных аўдыторый (інклюзіўны праект) «Перадай дабро па крузе» стаў доўгатэрміновым. Ён ужо знайшоў сваю ўдзячную аўдыторыю. А партнёры мерапрыемстваў – прадстаўнікі аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў ДУ «Лідскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» гарадоў Ліды і Бярозаўка, Лідскай раённай арганізацыі ГА «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», лідскай аб'яднанай арганізацыі ГА «Беларускае таварыства інвалідаў» прапаноўваюць новыя сустрэчы з творчымі людзьмі з інваліднасцю. Такім чынам, цеснае сяброўства з імі стала аб'яднаным адной мэтай – дарыць радасць і перадаваць дабро па крузе людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

Пералічым нашых удзельнікаў эстафеты дабра: Ганна Брэйва, Алеся Лянцэвіч, Вольга Мікша, маці і дачка Ала і Марына Кулеш, Сяргей Пачабут і Вера Саннікава, Дзмітрый Федчэнка, Дзяніс Бубноўскі і Надзея Санкевіч, Анастасія Ляўкевіч.

За час працы выстаў іх наведвальнікі пазнаёміліся з работамі, якія выкананы ў тэхніцы стрынг-арт, кінусайга, фаамірана і фетра, вышыўка бісерам, крыжыкам, гладдзю, змешаная тэхніка, графіка, мягкія цацкі і інш., а таксама пачулі цікавыя гісторыі, зрэзы з жыцця гэтых аўтараў. Былі прадэманстраваны канцэртныя выступленні, гучалі вершы, песні.

# МАКСІМ

На гэты раз, 3-га снежня, у Міжнародны дзень інвалідаў быў запрошаны вядомы ў горадзе і за межамі Беларусі пісьменнік Максім Бацкалевіч. Ён празаік, аўтар ужо шасці кніг: «Чётки», «Утро Максима», «Из дневников моей памяти», «30 размышлений по поводу», «Карцер души», «50 оттенков жизни». Коратка пра госця праекта.

Бацкалевіч Максім Валер’евіч, нарадзіўся 22 ліпеня 1994 года ў горадзе Баранавічы. Бацькі: Валерый Мікалаевіч і Алена Чэславаўна Бацкалевіч. У 1995 годзе, праз год пасля нараджэння Максіму паставілі дыягназ: дзіцячы цэрэбральны параліч (ДЦП), дызартрыя. Бацькі вазілі сына ў рэабілітацыйны цэнтр дзяцей з фізічнымі захворваннямі. Дзякуючы гэтаму, у пяць год Максім ужо змог самастойна сядзець і нават хадзіць з падтрымкай. Там, у Баранавічах, хлопчыку купілі спецыяльную азбуку, дзякуючы якой ён змог весці размову з бацькамі і з іншымі. Гэтай азбукай ён карыстаецца і па сённяшні дзень. Сям’я, пераехала ў вёску Мінойты, што ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці, дзе прайшло дзяцінства Максіма. У 2003 годзе Бацкалевічы пераязджаюць у Ліду. У тым жа годзе Максіма прынялі ў першы клас СШ № 17. Паступова хлопец засвоіў і камп’ютар. З любімых прадметаў сталі гісторыя, інфарматыка, англійская мова. Вучэбная праграма для Максіма была такая ж, як і для іншых, здаровых дзяцей. Стаў валодаць англійскай мовай, дзякуючы якой ён змог наладзіць камп’ютарную перапіску з сябрамі за мяжою. У 2013 годзе скончыў школу з залатым медалём. З-за праблем з маторыкай рук ён можа толькі набіраць 4 літары ў хвіліну (40 слоў у гадзіну), але ясны розум, аптымізм не пакінулі хлопца. І Максім знайшоў сябе ў творчасці. Такім чынам ён змог даказаць грамадству, што людзі з такім дыягназам і цяжкай формай могуць прынесці карысць, працаваць і дабівацца сваіх мэтаў. У выніку, ён з вялікімі складанасцямі, але ж націскаючы алоўкам на клавішы камп’ютара, змог набраць свае творы – апавяданні, якія выспявалі ў яго душы. За тры гады ў Максіма назапасіліся гатовыя творы, і ён пачынае шукаць у інтэрнэце магчымасці для публікацыі. Але нічога прыдатнага не знаходзіць, пакуль не трапляе на сайт Аляксандра Логінава «Бізнэс-лекар» і на інфармацыйным рэсурсе знаёміцца з прапановамі выдавецкага сэрвісу «Ridero». Максім напісаў ліст Аляксандру Мікалаевічу і не чакаў такога хуткага адказу. Было адразу відаць, што выдавец уважліва паставіўся да няпростага лёсу хлопца і хоча дапамагчы. Аляксандр Мікалаевіч Логінаў стаў рэдактарам, настаўнікам і проста добрым сябрам Максіма Бацкалевіча. У 2018 годзе ў выдавецтве «Ridero» (Екацярынбург) пабачылі свет зборнікі аўтабіяграфічных апавяданняў Максіма Бацкалевіча «Чётки» і «Утро Максима». Пазней два гэтыя зборнікі былі аб’яднаны ў адну кнігу пад назвай «Из родника моей памяти». Менавіта гэтую кнігу маладога пісьменніка з Беларусі выдавецтва «Ridero» вылучыла на конкурс «Ліцэй», які праводзіўся ў Маскве ў гонар дня нараджэння вялікага рускага паэта Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Як прызнаецца сам Максім, удзел у гэтым конкурсе дапамог яму паверыць у сябе. У 2019 годзе ў выдавецтве «Ridero» выйшлі кнігі Максіма Бацкалевіча «30 размышлений по поводу» і «Карцер души». Гэтыя выданні адрозніваюцца ад папярэдніх філасофскім поглядам на жыццё. У маі 2020 года пабачыла свет шостая кніга пісьменніка пад назвай «50 оттенков жизни». Піша празаік на рускай мове. Жыве ў горадзе Ліда. Хлопец перамяшчаецца ў інвалідным вазку. А 24 лістапада 2020 года згодна з рашэннем Прэзідыума рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі Максім Валер’евіч Бацкалевіч стаў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, папоўніў шэрагі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Калегі па пяры з задавальннем прынялі творцу ў свае шэрагі, пазначылі: «Нягледзячы ні на што, усім нам неабходна ўсведамляць, што членства ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі прадугледжвае актыўную працу, прагрэсіўнае мысленне, нястомны пошук аптымальных шляхоў і сродкаў творчага самавыражэння, а таксама адказнасць перад багатай

культурнай спадчынай Прынёманскага краю за яе заўтрашні дзень. Ёсць надзея на тое, што з прыходам у наш калектыў Максіма Бацкалевіча мы станем яшчэ больш добрымі і больш уважлівымі адзін да аднаго. Сардэчна віншуем Максіма Валер’евіча Бацкалевіча з уступленнем у шэрагі грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» і шчыра жадаем нашаму маладому калегу здароўя, новых творчых здзяйсненняў і веры ў свае сілы».

Разам з Максімам удзельнікамі мерапрыемства, якое невыпадкова атрымала назву «Жыць і тварыць наперакор лёсу», сталі бацькі маладога пісьменніка-інваліда – маці Алена Чаславаўна і бацька Валерый Мікалаевіч, а таксама настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 17 горада Ліда Яніна Іосіфаўна Вансевіч, якая добра ведае сям’ю Бацкалевічаў, былі і прыхільнікі праекта.



Былі прадстаўлены кнігі Максіма Валер’евіча *(на фота)*. Гісторыяй іх напісання падзяліліся бацькі. Яны расказалі пра нараджэнне сына, пра шлях Максіма ў атрыманні ведаў па агульнаадукацыйнай праграме ў СШ № 17, пра яго намаганні ў засваенні камп’ютара (націскаючы алоўкам па яго клавіятуры, хлопец набіраў 40 слоў у гадзіну і такім чынам выдаў ажно 6 кніг!..

Разам з тым былі прадэманстраваны відэасюжэты, якія дапамаглі акунуцца прысутным у жыццё і творчыя будні пісьменніка. Зацікаўленая аўдыторыя змагла набыць кнігі аўтара з экслібрысам. Трэба зазначыць, што ўсе ранейшыя ўдзельнікі эстафеты дабра дзяліліся сваімі гісторыямі, лёсавызначальнымі эпізодамі з жыцця. Сапраўды, можна сабраць гэтыя шчымлівыя аповеды і выдаць кнігу. Яна стала б для нас, магчыма і настольнай, бо разгарнула б перад намі шэрыя будні, пэўныя жыццёвыя абставіны, якія, парой нам здаюцца невырашальнымі. Але ж у тым, што заўсёды ёсць выхад у любой сітуацыі, што жыццё не скончаецца пад цяжарам розных акалічнасцяў, можна ўпэўніцца, калі чытач пазнаёміцца з кнігамі Максіма Бацкалевіча, які не здаўся, нягледзячы на вельмі складаныя перапетыі ў жыцці і праявіў сябе як майстар слова, філосаф, лекар душы.

**Алесь ХІТРУН,**
навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея

**На фота:** у Міжнародны дзень інвалідаў у Доме Валянціна Таўлая Лідскага гісторыка-мастацкага музея ў межах інклюзіўнага праекта пад назвай «Перадай дабро па крузе» з прэзентацыяй уласнай творчасці выступіў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік Максім Бацкалевіч. Ліда, 3 снежня 2023 года.


















**У прэзентацыях творчасці лідскага празаіка Максіма Бацкалевіча разам з кнігамі традыцыйна дэманструецца яго пасведчанне члена Саюза пісьменнікаў Беларусі**




**Афіша мерапрыемства**






ЛИДСКИЙ ИСТОРИКО-ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ МУЗЕЙ